# Герб школы




Герб уяўляе сабой гербавае палатно ў форме старажытнага шчыта, які па форме супадае з гістарычным гербам Ашмянскага раёна. Фон герба блакітнага колеру, які сімвалізуе шчырасць, гонар, славу і адданасць. Унізе размешчана ўзыходзячае сонца, знак перавагі духоўнасці , гэта галоўны сімвал жыцця. Жоўты колер азначае вернасць, давер, а таксама развіццё, рух наперад, надзеі і мары. Промні сонца разыходзяцца па ўсяму палатну герба. На іх фоне, над сонцам, размешчана раскрытая кніга - эмблема адукацыі, ведаў, мудрасці. Белыя старонкі сімвалізуюць светлы розум.

На заднім плане герба размешчаны сілуэт сярэдневяковага паселішча чырвонага колеру на знак таго, што вёска Граўжышкі мае старажытнае паходжанне і заўсёды была адміністрацыйным цэнтрам акругі. Аб гэтым сведчыць тое, што на картах Вялікага княства Літоўскага яна была паказана яшчэ ў XVI стагоддзі. На гербе гэтая дата пазначана на сцягу над сілуэтам паселішча. Чырвоны колер сімвалізуе смеласць, мужнасць, любоў да Радзімы, а таксама кроў пралітую ў барацьбе.

Аблямаваннем герба служаць: знізу – выявы жытніх каласоў жоўтага колеру, як знак таго, што школа размешчана ў сельскай мясцовасці, яны з’яўляюцца сімвалам працы чалавека на зямлі і,акрамя гэтага, каласы сімвалізуюць вялізарны плён і залог працоўнага поспеху ў будучым; зверху – стылізаваны разгорнуты ручнік з беларускім арнаментам , як знак таго , што выхаваўчы працэс у школе грунтуецца на народных традыцыях.